МЕРКАВАННІ

ФОРМУЛА ВАДЫ

Як на смак адрозніць калодзежную ваду ад водаправоднай? Ці п'е ваду з-пад крана дырэктар Водаканала? І ці адпавядае нормам вада ў сталіцы? Пра якасць найважнейшага прыроднага рэсурсу мы запыталі тых, хто арыентуецца ў гэтым пытанні як рыба ў вадзе.

Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, прэс-сакратар Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

— Асабіста я выкарыстоўваю звычайную ваду з-пад крана, якая цячэ ў кожнай кватэры Мінска. І якасць яе задавальняе. У мяне ёсць маленькае дзіця — яму я заказваю бутыляваную ваду.

Марыя ЛІСТАПАДАВА, старшыня Запольскага сельскага Савета дэпутатаў Бялыніцкага раёна:

— Я ў асноўным выкарыстоўваю ваду з калодежа. Яна чыстая — у норме па нітратах і па мутнасці. Мы сумесна з санстанцыяй адзін-два разы ў год, па неабходнасці, робім аналіз. Можна заўважыць адрозненне калодзежнай вады па смаку — яна больш мяккая, чым з-пад крана. Калі калодзеж чысты і дастаткова глыбокі, то і вада там смачнейшая.

Дзмітрый ДРОЗД, дырэктар прадпрыемства «Водаканал Мінскага раёна»:

— Дзейнасць нашай арганізацыі распаўсюджваецца на 240 населеных пунктаў, дзе мы з'яўляемся пастаўшчыкамі паслуг. Кантроль якасці вады ў Мінскім раёне праводзіцца наступным чынам. У нас заключаны дагавор з органамі санітарнага нагляду — сваёй лабараторыі няма. Згодна з распрацаванай праграмай, кожны месяц, тыдзень ці квартал бяром пробы. У залежнасці ад вынікаў назначаюцца мерапрыемствы па паляпшэнні якасці вады.

У нас ёсць 470 свідравін. Калі ў якой-небудзь з іх паказчык па нітратнасці будзе вышэйшы за норму, мы адразу выводзім свідравіну з эксплуатацыі і прамываем. Летась такіх выпадкаў было шэсць. Напрыклад, у пасёлку Анопаль тры месяцы дзейнічала абмежаванне па выкарыстанні вады. Мы ўсталявалі станцыю, якая выдаляе нітратную групу і жалеза, і ўсе абмежаванні знялі.

Цяпер самая вялікая праблема для Мінскага раёна — гэта колькасць жалеза ў вадзе. На гэты элемент санітарнымі нормамі ўсталяваны жорсткі нарматыў. Каля 75 % проб па жалезе праходзяць праверку, а з астатнімі ёсць праблемы. Жалеза — прыродны паказчык, таму змагацца з гэтай праблемай можна толькі ўсталяваннем станцый абезжалезвання. Сам я, дарэчы, п'ю ваду з-пад крана — ніякіх праблем з якасцю няма.

Наталля САЗАНАВА, намеснік начальніка вытворчасці «Мінскводаправод» УП «Мінскводаканал»:

— Маніторынг якасці вады ў сталіцы праводзіцца згодна з праграмай вытворчага кантролю на пяць гадоў. Яна зацвярджалася ў 2016 годзе Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам і праходзіла экспертызу ў Мінскім гарадскім цэнтры гігіены. Там прапісана перыядычнасць зняцця паказчыкаў, самі паказчыкі, па якіх адбіраюцца пробы. Мы прытрымліваемся санітарнага заканадаўства, і ўся пітная вада ў сталіцы адпавядае нормам. Кожны дзень праводзіцца маніторынг якасці кантрольных кропак у горадзе. У нас ёсць акрэдытаваная цэнтральная лабараторыя, якая выконвае вялікі спектр аналізаў. У сваю чаргу тэхналагічныя лабараторыі, якія знаходзяцца на некаторых водазаборах, могуць кантраляваць якасць вады кожны дзень. Але афіцыйна па рабочай праграме мы кантралюем якасць у свідравінах кожны квартал. Пры гэтым бываюць дадатковыя заборы ў залежнасці ад неабходнасці.

Згодна з правіламі карыстання «Мінскводаканал» займаецца падачай вады, абслугоўваннем сетак і адказвае за якасць паслугі да мяжы балансавай прыналежнасці. Значыць, калі, напрыклад, гэта жылы дом, то да фундамента — гэта зона адказнасці «Мінскводаканала», пасля — ЖЭСа ці таварыства ўласнікаў. Здараецца, што ў кране карыстальніка якасць пагаршаецца з-за няякаснага выканання рэгламентных работ ва ўнутрыдамавых сетках.

Я п'ю ваду з-пад крана. І як чалавек, які адказвае за водападрыхтоўку і якасць вады ў Мінску, не баюся гэтага рабіць. Я ведаю, што ўся вада ў горадзе адпавядае нормам.

Марыя ДАДАЛКА.

ЧЫСТАЯ ВАДА

«ВЫМЫЦЬ» ЛІШНЯЕ ЖАЛЕЗА

Станцыя па абезжалезванні вады ў аграгарадку Кракоўка ў Ашмянскім раёне павінна з'явіцца сёлета ў маі. Населенаму пункту такое прыстасаванне жыццёва неабходнае, кажуць мясцовыя ўлады. Узровень жалеза ў тутэйшай вадзе ўдвая перавышае дазволеныя нормы, хоць па астатніх параметрах у прынцыпе адпавядае гранічна дапушчальным канцэнтрацыям розных рэчываў.

Празмерная колькасць жалеза ў вадзе — праблема многіх беларускіх мястэчак, аднак у ашмянскім краі, дзе карыстаюцца ў асноўным паверхневымі водамі з іх не найлепшымі пітнымі якасцямі, гэта найбольш адчувальна, кажуць раённыя камунальнікі. Каб вада ў аграгарадку Кракоўка стала якаснай па ўсіх крытэрыях, патрэбна станцыя коштам 207 тысяч рублёў. Адпаведную суму плануецца атрымаць па абласной інвестыцыйнай праграме (з абласнога інвестыцыйнага фонду). Там ужо пацвердзілі факт фінансавання будаўніцтва станцыі, аднак графікаў паступлення грошай пакуль няма.

Тым не менш спецыялісты жыллёва-камунальнай гаспадаркі запланавалі работы па ўзвядзенні станцыі на лета. Ужо падрыхтавана праектна-каштарысная дакументацыя, пройдзена экспертыза аб'екта. Каторы год мясцовая ЖКГ працуе з інфраструктурай: рамантуюць і перакладаюць водаправодныя сеткі ў аграгарадку Кракоўка. З 2014-га тут заменена ўжо больш як 3,5 кіламетра «водных» камунікацый.

— Будзе няправільна, калі станцыя з добрай фільтрацыяй запрацуе, а вада пацячэ па трубах, якія пракладваліся ў далёкія часы і большай часткай іржавыя, — пракаменціраваў работу **Вячаслаў ЯНКОЎСКІ, намеснік дырэктара Ашмянскага РУП ЖКГ.** — Людзі не атрымаюць эфекту, на які разлічваюць, і работа па будаўніцтве станцыі пройдзе ўпустую. Каб гэтага не здарылася, мы і займаемся заменай сетак.

Будаўніцтва станцыі абезжалезвання, а фактычна — некалькіх павільёнаў — не такая ўжо і складаная тэхнічна рэч, кажуць спецыялісты. Прывозіцца дадатковае абсталяванне для фільтрацыі, якое ўразаецца ў існуючую сістэму, і цыркуляцыя вады пускаецца яшчэ па адным крузе. На ўсё гэта разам з добраўпарадкаваннем тэрыторыі вакол спатрэбіцца каля месяца.

Цэнтралізаванай водаправоднай сістэмай у Кракоўцы карыстаецца 988 чалавек. Намеснік дырэктара Ашмянскай ЖКГ не выключае, што са з'яўленнем станцыі абезжалезвання іх колькасць павялічыцца.

Хоць з'яўленне чыстай вады ў кожнай дадатковай хаце, безумоўна, радуе, спецыялісты кажуць, што так павінна быць паўсюдна. Таму побач са станоўчым настроем у іх заўжды прысутнічае пачуццё дыскамфорту ад таго, што яшчэ не ўсё зроблена і наперадзе шмат работы па ўдасканаленні якасці пітнёвага — ужо ў іншых месцах. Наступныя населеныя пункты ў Ашмянскім раёне, якім таксама вельмі патрэбны станцыі абезжалезвання, — гэта аграгарадкі Навасёлкі і станцыя Ашмяны.

Прагназаваць, калі сітуацыя выправіцца і там, спецыялістам цяжка. Можа, гэта здарыцца ў 2019-м, а можа і не. Праграма «Чыстая вада», якая паспяхова стартавала ў свой час у Беларусі, на працягу апошніх пяці гадоў буксавала. Сёлета вада зноў стала адным з прыярытэтных кірункаў работы. Думаецца, у немалой ступені садзейнічала гэтаму заўвага Прэзідэнта да якасці пітной вады на мінулагоднім кастрычніцкім рэспубліканскім семінары «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны». Кіраўнік дзяржавы заўважыў тады: «26 % проб вады ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях не адпавядаюць патрабаванням нарматываў па колькасці жалеза. Забяспечанасць станцыямі абезжалезвання па рэспубліцы — 42 %. Гэтае пытанне неабходна вырашыць да 2025 года».

— Мы не забываем аб праблеме людзей. Як толькі скончым станцыю ў Кракоўцы, адразу займемся праектаваннем наступных станцый, каб не губляць час, — запэўніў намеснік дырэктара ЖКГ. — Якасць вады непасрэдна ўплывае на стан здароўя чалавека. Так што будаўніцтва станцый абезжалезвання — гэта архіважная задача.

У Беларусі трэба збудаваць 1200 станцый абезжалезвання, і гэта толькі ў пасёлках, дзе пражывае звыш 100 чалавек. Аднак аблвыканкамі летась збудавана толькі 10 станцый на суму 8,6 млн рублёў. З якіх 7 млн — крэдытныя рэсурсы, афармленыя па мэтавых дзяржаўных праграмах. Пры гэтым Гомельская, Гродзенская і Магілёўская вобласці ў 2017-м не выдзелілі на гэты кірунак ні капейкі. *(З матэрыялаў выніковай калегіі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі за 2017 г.)*

Усяго ў Гродзенскай вобласці абласной інвестыцыйнай праграмай на будаўніцтва станцый абезжалезвання запланавана выдаткаваць каля мільёна беларускіх рублёў. Чыстая вада прыйдзе, як мяркуецца, у Ваўкавыскі, Слонімскі, Лідскі, Навагрудскі раёны. А ў Шчучынскім і Гродзенскім раёнах з'явяцца артэзіянскія свідравіны.

Ірына СІДАРОК.

ЗДАРЭННІ

Такія вітаміны нам не патрэбны

Неспрыяльнае надвор'е не перашкодзіла магілёўскім мытнікам разам з інспектарамі дарожнага руху годна несці сваю службу.

У Горацкім раёне прыпынены рух грузавога аўтамабіля SCANIA, які нелегальна перавозіў 20 тон яблыкаў на 61 тысячу рублёў. Як паведаміла прэс-служба Магілёўскай мытні, у кіроўцы не аказалася ні суправаджальных дакументаў на гэты груз, ні фітасанітарнага сертыфіката. Машына, дарэчы, належыць расійскаму суб'екту гаспадарання і трымала курс на Расію. За невыкананне беларускага заканадаўства парушальніку свеціць штраф у памеры да 50 % ад кошту тавару (частка 4 артыкула 12.17 КаАП Рэспублікі Беларусь).

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Пажар са сталёвым адценнем

Увечары ў электраплавільным цэху Беларускага металургічнага завода спрацавала пажарная сігналізацыя. Літаральна праз адну хвіліну ратавальнікі былі на месцы падзей. Яны ўбачылі, што тунэль, у якім пракладзены сілавыя кабелі, па якіх падаецца электраэнергія, моцна задымлены.

— Нашы байцы аператыўна ліквідавалі ўзгаранне, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — На шчасце, ніхто не пацярпеў. Але разам з тым полымя пашкодзіла больш за 30 тысяч пагонных метраў ізаляцыі электрычных кабеляў. З-за гэтага быў спынены тэхналагічны працэс выплаўкі сталі.

Як паведаміў **прэс-сакратар Беларускага металургічнага завода Аляксандр АЛЕСІК,** меркаванай прычынай пажару стала кароткае замыканне. Часова спыніліся тры цэхі — электрасталеплавільны № 1, сортапракатны № 1 і капаравы. Таксама была парушана заводская тэлефонная і інтэрнэт-сувязь.

— Зараз на прадпрыемстве распрацоўваецца пакрокавы план, які дапаможа пераадолець наступствы надзвычайнага здарэння. На шчасце, вытворчыя страты будуць мінімальныя. Сталеплавільную вытворчасць да гэтага планавалася прыпыніць з 7 да 14 сакавіка для мадэрнізацыйных работ. Але ліквідаваць наступствы здарэння мы будзем адначасова з гэтымі работамі.

На месца падзей асабіста выязджаў **міністр прамысловасці Віталь Воўк**, каб арганізаваць аператыўны штаб па ліквідацыі наступстваў узгарання на прадпрыемстве.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.